***Н.В. Ратынская***
Мінск (Беларусь)

# РОЛЯ М. ГАРЭЦКАГА Ў НАЦЫЯНАЛЬНЫМ АДРАДЖЭННІ, ФАРМІРАВАННІ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ

Максім Гарэцкі — мастак арыгінальнага, самабытнага таленту, адзін з пачынальнікаў сучаснай беларускай прозы. Уся яго творчасць прасякнута пачуццём любові да Радзімы, яе гісторыі, традыцый, нацыянальнай культуры. Без яе цяжка ўявіць працэс станаўлення нашага нацыянальнага мастацтва, складаныя шляхі беларускай прозы. Як арыгінальны пісьменнік М. Гарэцкі па-свойму разумеў задачы мастацтва. Ён раіў не спыняцца на паказе знешніх праяў рэчаіснасці. Цэнтральная думка ўсёй пісьменніцкай спадчыны Гарэцкага наступная: "Што яно жыццё, спрадвечнае і патаемнае, і людзі ў ім — такія розныя, часам дзіўныя, людзі-філосафы, мысліцелі?" Адсюль ідзе спалучэнне прадметнага і абстрактнага, лірычнага і сатырычнага ў яго творах. М. Гарэцкі разам з іншымі выдатнымі беларускімі пісьменнікамі ўзнімаў беларускую літаратуру на ўзровень сусветнай вартасці, удала карыстаючыся нацыянальнымі набыткамі і традыцыямі.

Знешне біяграфія М. Гарэцкага не вельмі багатая на падзеі, але духоўнае жыццё пісьменніка было надзвычай напружаным, складаным. У юнацкім узросце стаў захапляцца беларускімі творамі. У гэтыя часы ў юнаку нараджаецца будучы барацьбіт за нацыянальнае і сацыяльнае вызваленне свайго народа. Тады ж ён пачынае свядома карыстацца беларускай мовай, выяўляць нязгоду з пагардлівымі адносінамі да бацькоўскага слова. Самастойная літаратурная праца пачалася непрыкметна з невялікіх нататкаў, допісаў, а потым і фельетонаў, што друкаваліся на старонках «Нашай нівы».

Літаратурным дэбютам Гарэцкага стала апавяданне «У лазні», апублікаванае ў 1913 г. пад псеўданімам Максім Беларус. Адно за другім пачалі з'яўляцца новыя апавяданні («Стогны душы», «Роднае карэнне», «У панскім лесе», «Красаваў язмін», усе — 1913), большасць якіх увайшло ў зборнік «Рунь» (1914).

Першымі апавяданнямі «У лазні», «Патаемнае» і інш. малады пісьменнік прыкметна рассунуў тэматычныя і жанрава-стылявыя межы беларускай прозы, трывала замацаваўшы ў ёй тып сюжэтна разгорнутага сацыяльна-псіхалагічнага апавядання. Бясспрэчнай заслугай М. Гарэцкага з'яўляецца і тое, што ён увёў у нацыянальную прозу новага героя — вясковага інтэлігента, які ўсведамляе сваю адказнасць за лёс народа і будучыню роднага краю.

Здольнасць Гарэцкага бачыць пазітыўныя моманты сялянскага жыцця з'явілася новым крокам маладой беларускай прозы ў эстэтычным асваенні сацыяльнай рэчаіснасці і сферы духоўнай практыкі чалавека.

Адным з канкрэтных праяўленняў наватарства М. Гарэцкага ў мастацкай прозе была таксама распрацоўка гістарычнай тэматыкі. Апавяданнямі на тэму мінуўшчыны беларускага народа («Князёўна», «Войт», «Лірныя спевы») Гарэцкі ўпісаў яскравую старонку ў гісторыю нацыянальнага прыгожага пісьменства.

У сваіх творах М.Гарэцкі апрацаваў народна-дыялектную мову, беларускі фальклор з рэалістычнымі традыцыямі роднай, рускай і сусветнай літаратуры і ў той жа час стаў наватарам беларускай нацыянальнай прозы. Любоў да народна-дыялектнай мовы ішла да М.Гарэцкага ад самога жыцця, ад любові да свайго краю, Радзімы. Рознага роду дыялектызмы разам з агульнанароднымі словамі і словаформамі ствараюць натуральнасць, праўдзівасць, непаўторны каларыт у кожным творы пісьменніка, развіваюць варыянтнасць і сінаніміку беларускай літаратурнай мовы.

Агульнавядомым з'яўляецца той факт, што мова пісьменніка так ці інакш адлюстроўвае мову таго гістарычнага перыяду, у які аўтар жыў і пісаў. І тут варта падкрэсліць, што «вывучэнне мовы мастацкай літаратуры адкрывае шырокія магчымасці разумення агульных заканамернасцей развіцця літаратурнай мовы пэўнага перыяду і нават у некаторых творах — яшчэ больш: мовы агульнанароднай. Аднак неабходна памятаць, што мастацкі твор дае эстэтычна трансфармаванае адлюстраванне «моўнага жыцця» народа ў сувязі з ідэйнымі задумамі пісьменніка і метадам яго творчасці». Таму пры вывучэнні мовы мастацкай літаратуры неабходна ўсебаковае даследаванне таго моўнага матэрыялу, які выкарыстоўвае пісьменнік.

Станаўленне Максіма Гарэцкага як пісьменніка прыпадае на 20—30-я гг. Ён стаяў ля фармавання літаратурнай мовы, яе нормаў, стыляў. Таленавіты вучоны, публіцыст-літаратар, самабытны пісьменнік, грамадзянін, “сапраўды цэласная натура”.

Адно з цвёрдых перакананняў М.Гарэцкага — вера ў велічную духоўную значнасць роднай мовы. Шырокае выкарыстанне народнага слова — адметная асаблівасць творчай манеры пісьменніка. На старонках яго твораў загучалі магілёўскія гаворкі. «Ён чэрпаў з чыстых народных крыніц, прычым чэрпаў, пісаў праўдзіва, як чуў. У яго мове ёсць натуральнасць, праўдзівасць, зусім няма штучнасці. Усё ішло ад жыцця, ад слова народнага».

Творчасць М. Гарэцкага — наша спадчына, якая адорвае светам духоўнасці кожнага, хто ўдумліва, шчыра аддаючыся ходу думак і пачуццяў аўтара, чытае і перачытвае яго выдатныя творы.

Заслугі Максіма Гарэцкага перад беларускай літаратурай наступныя: адзін з заснавальнікаў беларускай нацыянальнай прозы; увёў у літаратуру вобраз героя-інтэлігента; стаіць ля вытокаў беларускай філасофскай, інтэлектуальнай, дакументальна-мастацкай прозы; яму, разам з В. Ластоўскім і К. Каганцом, належыць гонар асваення ў беларускай літаратуры гістарычнай тэмы; стварыў драматычную аповесць «Антон» — жанр, новы для беларускай літаратуры.

У асобе Максіма Гарэцкага мы, несумненна, маем аднаго з буйнейшых прадстаўнікоў нашага прыгожага пісьменства найноўшага часу і можам гэтым ганарыцца перад усім светам. Няхай людзі дападаюць да твораў Максіма Гарэцкага. У асноўным творы чытачу сталі даступнымі. Навуковая цікавасць з кожным днём узрастае.

**_А.А. Босак_**
Мінск (Беларусь)

## ДЫЯЛЕКТЫ І НАРОДНЫЯ ГАВОРКІ ЯК КРЫНІЦА ФАРМІРАВАННЯ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ

Народныя гаворкі і літаратурная мова цесна звязаны паміж сабой. Літаратурная мова фарміравалася на аснове вызначаных гаворак і дыялектаў, якія аказалі на яе вялікі ўплыў. Аднак і на сучасны момант існуюць цесныя ўзаемасувязі паміж літаратурнай мовай і жывымі народнымі гаворкамі.

З аднаго боку літаратурная мова цесна пранікае ва ўсе сферы жыцця насельніцтва, актыўна выцясняючы многія мясцовыя словы і выразы. Аднак і народныя гаворкі да гэтага часу непасрэдна ўзбагачаюць літаратурную мову, перш-наперш лексічнымі і фразеалагічнымі сродкамі.

Узбагачэнне лексікону літаратурнай мовы дыялектызмамі ажыццяўляецца двума асноўнымі шляхамі: 1) дыялектныя словы пападаюць у агульныя слоўнікі спачатку лексемамі з адзнакамі "*мясцовая, дыялектная* ці *абласная*", а ў наступных выданнях слоўнікаў ужо прыводзяцца без прыведзеных адзнак; 2) дыялектызмы даволі шырока ўжываюцца пісьменнікамі ў мастацкіх творах, што садзейнічае пранікання дыялектных слоў з ідыястылю асобнага аўтара ў сучасную літаратурную мову. Пры гэтым характар выкарыстання рэгіянальных лексем рознымі аўтарамі вызначаецца разнастайнасцю і залежыць ад месца нараджэння канкрэтнага пісьменніка, тэматыкі яго твораў, стылістычных мэт, асаблівасцей і каларытнасці мовы галоўных герояў, а таксама аўтарскага стылю.

Трэба адзначыць, што не толькі літаратурныя мовы, у прыватнасці руская і беларуская, маюць значныя ўзаемасувязі, але і дыялекты, перш-наперш сумежныя. Так, усходнія беларускія гаворкі маюць шмат агульных рыс са смаленскімі і бранскімі гаворкамі Расійскай Федэрацыі; заходнія беларускія гаворкі — з гаворкамі Беласточчыны на тэрыторыі сучаснай Польшчы; заходнепалескія гаворкі — з суседнімі ўкраінскімі дыялектамі.

З пункту развіцця і ўзаемасувязей дыялектаў асаблівую цікавасць мае рэгіён, які знаходзіцца на мяжы Беларускага Панямоння і Заходняга Палесся, у тым ліку рэгіён верхняга Над'ясельддзя (Пружанскі раён Брэсцкай вобласці і сумежжа), дзе існуе значная колькасць народных гаворак і дыялектаў.